Увага! Самы позні тэрмін здачы рэкламных аб'яў у чарговы нумар — аўторак да 15 гадзін.

Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Выходзіць з 1997 года.

№ 43 (72). Слонім. 22 — 28 кастрычніка 1998 г. **Незалежны грамадска-палітычны штотыднёвік** Кошт свабодны

ВЁСКА

АХ, БУРАКІ, КАРМАВЫЯ І ЦУКРОВЫЯ

Скончылася капанне бульбы, а адпачываць селяніну няма калі — буракі чакаюць. "Калі бульба не ўродзіць, дык бураком пераб'емся", — гаворачь вяскоўцы. Таму і едуць з горада ў вёску слонімцы да сваіх сваякоў, каб дапамагчы назапасіць на зіму буракоў. Назапасіць, у першую чаргу, у прыватныя склепы, каб было чым зімою кароўку і свіней падкармліваць. А калгасу, кажуць, колькі ні дай — усё мала.

Яшчэ зусім нядаўна калгаснік з дзялкі буракоў афіцыйна атрымліваў толькі плату за здадзены ў калгас ураджай, прычым даволі невялікую. Неафіцыйна ж, як тое цягнецца з моманту ўтварэння калгасаў, можна было ўзяць (украсці) колькі трэба на зіму для сваёй хатняй гаспадаркі, але пры абавязковай умове — не пападайся начальству. А калі ўжо не пашанцавала, тады прасіся, каб не штрафавалі. Бо штраф быў вялікі. А калі старшыня ці брыгадзір падыходзілі да гэтай справы прынцыпова, то чалавека маглі і ў турму пасадзіць.

У апошнія гады, як вынік знакамітай перабудовы, сітуацыя з вырошчваннем буракоў змянілася. Дзялкі, праўда, як былі дзялкамі, так імі і засталіся. Але цяпер са сваёй дзялкі калгаснік мае законнае права ўзяць

10-20% (як пастановіць праўленне калгаса) ураджаю сабе. Не цяжка падлічыць, што чым большай будзе дзялка, тым больш ,,працэнт" застанецца чалавеку. А за здадзеныя ў калгас буракі чакае недзе ў канцы

года ўсё тая ж невялікая плата (сёлета прыкладна 200 тыс. руб. за тону). Тым не менш стымул працаваць і на гэтыя працэнты ёсць... Была б толькі сіла.

Мікола КАНАНОВІЧ, Мікалай СУПРУН (фота)

НАВІНЫ

❍ **БЕЛАРУСЬ ВЫШЛА НА ПЕРВОЕ МЕСТО СРЕДИ СТРАН БЫВШЕГО СССР ПО СТЕПЕНИ ОБЕСЦЕНИВАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОЙ ВАЛЮТЫ ПО ОТНОШЕНИЮ К ДОЛЛАРУ США БЕЗ УЧЕТА ДЕНОМИНАЦИИ, ПРОВОДИВШЕЙСЯ ПРИ ИХ ВВЕДЕНИИ ИЛИ ЖЕ В ПЕРИОД ОБРАЩЕНИЯ.**

По состоянию на 19 октября, в пятерку стран с наиболее обесценившимися валютами вошли Беларусь — 2.900.000, Туркменистан — 2.600.000, Грузия — 1.350.000, Украина — 342.000 и Узбекистан — 106.000 условных рублей за один доллар.

❍ **ПО МНЕНИЮ УЧАСТНИКОВ МЕЖДУНАРОДНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ, АГРАРНАЯ РЕФОРМА В БЕЛАРУСИ ОБРЕЧЕНА НА ПРОВАЛ, ЕСЛИ ГОСУДАРСТВО НЕ ИЗМЕНИТ СВОЕЙ ПОЛИТИКИ В ЭТОЙ СФЕРЕ.**

По словам заведующего сектором социального развития села БелНИИЭИАПК кандидата экономических наук Михаила Антоненко, «государство проводит прежнюю политику ограбления крестьян, оплачивая лишь половину поставляемой продукции и практически бесплатно изымая остальную ее часть».

❍ **МИНИСТЕРСТВО ТОРГОВЛИ БЕЛАРУСИ ПРЕДЛОЖИЛО ПРАВИТЕЛЬСТВУ РАЗРЕШИТЬ РЕАЛИЗАЦИЮ ТОВАРОВ КАК ЗА РУБЛИ, ТАК И ЗА ИНОСТРАННУЮ ВАЛЮТУ.**

Основная цель, которую преследует своим предложением Минторг, заключается в нормализации ситуации на потребительском рынке и увеличении валютных поступлений.

❍ **БЕЛОРУССКИЕ ЛИБЕРАЛ-ДЕМОКРАТЫ НАМЕРЕНЫ ДОБИВАТЬСЯ ДЛЯ А. ЛУКАШЕНКО ПРАВА БАЛЛОТИРОВАТЬСЯ НА ПОСТ ПРЕЗИДЕНТА РОССИЙСКОЙ ФЕДЕРАЦИИ.**

По мнению Высшего совета ЛДП, это «соответствует духу существующего Союза Беларуси и России».

❍ **ЦЕНЫ НА ОТОПЛЕНИЕ ДЛЯ НАСЕЛЕНИЯ ПОВЫШАТЬСЯ НЕ БУДУТ, ЗАЯВИЛ ПРЕМЬЕР-МИНИСТР С.ЛИНГ В ХОДЕ ЗАСЕДАНИЯ ПРЕЗИДИУМА СОВМИНА.**

Как было отмечено, население республики сегодня компенсирует за счет собственных средств не более 20% расходов на производство потребляемой энергии.

❍ **ОЧЕРЕДНОЙ СКАЧОК ЦЕН ЗАФИКСИРОВАН НА ПРОШЛОЙ НЕДЕЛЕ НА МИНСКИХ ПРОДОВОЛЬСТВЕННЫХ РЫНКАХ.**

Стоимость муки возросла на 28% (с 28-32 до 32-45 тыс. руб. за килограмм), сахара — на 26% (с 50-52 до 64-65 тыс. руб.), куриных окорочков — на 15% (со 170-175 до 197-200 тыс. руб.), круп — на 14% (в частности, гречневой с 85-90 до 95-105 тыс. руб.), макаронных изделий — на 11% (с 48-75 до 52-85 тыс. руб.), свежемороженой рыбы — на 5%. Среди импортируемых фруктов заметнее всего подорожали бананы — на 41% (с 65-80 до 95-110 тыс. руб.) и цитрусовые — на 21% (в частности, апельсины с 80-95 до 100-120 тыс. руб.).

БелаПАН

Правяраюць слонімскую міліцыю

У Слонім прыбыла група супрацоўнікаў абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў на чале з палкоўнікам Вацлавам Дырліцам.

Гродзенскія міліцыянеры правяраюць аператыўна-службовую дзейнасць слонімскіх калег.

Валянцін ЧУРЫЛА

Падаражэе гарадскі транспарт

З 1 лістапада падаражэе праезд у гарадскім транспарце.

Ён будзе каштаваць 3000 рублёў. Адначасова стануць даражэйшымі і праяздныя білеты (120 і 60 тыс. руб.).

Сяргей ЁРШ

Напоминаем

25 октября на территории нашей страны мы должны перевести стрелки часов на один час назад.

С этого момента начнем жить по-зимнему времени.

Наталья ФУРСОВА

Маладзёжны семінар

У Слоніме прайшоў трэнінгавы семінар "Будучыню будуем разам" для маладзёжных лідэраў.

У семінары ўдзельнічалі школьнікі і навучэнцы тэхнікумаў. Яны разглядалі маладзёжныя праблемы і шляхі іх вырашэння, а таксама гаварылі пра лідэрства сярод моладзі. Гэтае мерапрыемства арганізавала Слонімскае маладзёжнае аб'яднанне "Вецразь" пры ўдзеле мінскага Цэнтра грамадзянскай адукацыі.

Алесь МАСЮК

ЗАГЛЯНЕМ НА РЫНОК

Цены (в тыс.руб.)

	04.10	18.10
свинина	110-200	100-170
говядина	80-190	90-150
телятина	100-170	100-160
сало	170-180	150-180
баранина	100-140	130-150
молоко	8	10
сметана	36	45
масло сл.	120	140
творог	28	30-35
помидоры	50	80
чеснок	60-70	60-70
картофель	8-10	8-10
яйца (1дес.)	45	45-50
капуста	8-10	8
морковь (1пуч.)	15	10-12
яблоки	8-10	10-15
лук	-	30
перец	-	60-70
свекла	8-10	7-10

ЗДАРЭННІ

"Рэвізоры" падвалаў

Днямі жыхар з вуліцы Чырвоных партызан паведаміў у міліцыю, што ў ягоным падвале зламаны дзверы і ўкрадзена кансерваванай прадукцыі на суму звыш 2 мільёнаў рублёў.

Работнікі міліцыі затрымалі злодзеяў.

Абрабаваў непаўналетняга

На мінулым тыдні міліцыя за рабаўніцтва затрымала жыхара вёскі Паўлава К.

Мужчына накінуўся на хлапчука і адабраў у яго веласіпед. Але доўга ездзіць на двухколцы рабаўніку не давялося, бо на яго хутка выйшла міліцыя.

Гандляр-злодзей

За крадзёж веласіпеда міліцыя затрымала слонімца Б., які гандляваў старымі рэчамі ля гарадскога рынку.

Ён раптоўна сеў на веласіпед, які без нагляду пакінула сланімчанка, і пачаў кружыць на веласіпедзе па вуліцах горада, пакуль злодзея не злавіла міліцыя.

Валянцін ЧУРЫЛА

АДПАЧЫНАК

НА ДЫСКАТЭЦЫ МУЗЫКА ГУЧАЛА...

Сяргей ЧЫГРЫН, Мікалай СУПРУН (фота)

Днямі вырашыў успомніць маладосць і завітаў на дыскатэку "Майстар", якая знаходзіцца ў РДК. Кампанію

мне склаў наш фотакарэспандэнт Мікалай Супрун. Разам усё ж весялей, хоць і без дзяўчат. У РДК нас прапусцілі загадзя. Тым часам на вуліцы збіралася моладзь, якая чакала 22 гадзін — пачатку дыскатэкі, дзе ўжо працавалі бар, гардэроб, гучала лёгкая музыка. Дыск-жакей Дзяніс Валковічаў сказаў, што "Майстар" працуе тры разы на тыдзень: у пятніцу, суботу і нядзелю. З 17 гадзін да 20.00 дыскатэкі праводзяцца для школьнікаў, а з 22 гадзін для тых, каму споўнілася 18. Дарэчы, у Слоніме існуюць яшчэ дзве дыскатэкі: "Оскар", "Імпульс".

Пасля дваццаці дзвюх гадзін у РДК пачалі заходзіць хлопцы і дзяўчаты. Былі яны рознага ўзросту, па-рознаму апранутыя, і кожны меў свой асабісты настрой. Каля бара адразу ўзнікла чарга, дзе моладзь купляла піва, гарэлку, лімоны і напіткі.

(Працяг на стр. 2)

АДПАЧЫНАК

НА ДЫСКАТЭЦЫ МУЗЫКА ГУЧАЛА...

Пакуль публіка адпачывала, я вырашыў з некаторымі наведвальнікамі тусоўкі пазнаёміцца. Вось што я даведаўся.

Вольга і Святлана, работніцы гандлю:

– Дыскатэка "Майстар" нам вельмі падабаецца. Але хацелася б, каб танцы тут былі да трох гадзін ночы, бо хочацца натанцавацца ўволю. На "Оскар" мы не ходзім, бо вельмі дарагія там уваходныя білеты. Больш таго, там неяк сумна і цесна.

Святлана, студэнтка, вучыцца ў Мінску:

– У Мінску на дыскатэцы я была толькі адзін раз, але мне там не спадабалася. А дыскатэка "Майстар" – клас! Тут падабаецца амаль усё, вось толькі не люблю, калі ў танцавальнай зале кураць.

За адным са сталоў сядзела вясёлая кампанія юнакоў і дзяўчат. Пытаюся ў іх:

– Вы прыйшлі пазнаёміцца з кім-небудзь ці проста патанцаваць?

– Пазнаёміцца і патанцаваць.



– Пазнаёміцца на адзін вечар ці на ўсё жыццё?

– На ўсё жыццё.

– Вось я са сваім мужам (сядзеў з ёй побач) пазнаёмілася на дыскатэцы, – прызналася Сняжана. – Вучуся я ў Слонімскім медвучылішчы, а муж Юрый – працуе. Мы на дыскатэку ходзім тры разы на тыдзень. А наша маленькае дзіця глядзіць дзядуля і грошы на дыскатэку ён нам дае. Мы яшчэ маладыя і хочацца пабыць са сваімі равеснікамі, падзяліцца навінамі.

Нашы сябры вучацца і працуюць у розных гарадах: у Гродна, Мінску, Баранавічах. Тыдзень не бачымся, і навін збіраецца шмат.

Трое прыгожых хлопцаў: Аляксандр, Дзмітрый і Аляксандр сядзелі на падаконніку і пілі піва.

– Хлопцы, а дзе вашы дзяўчаты, калі не сакрэт? – пацікавіўся я.

– Танцуюць. А мы не хочам.

– Вам "Майстар" не падабаецца?

– Лепшай дыскатэкі няма ў Слоніме, таму ходзім сюды. Але і тут "фокусаў" хапае.

– Якія "фокусаў"?

– Бывае ў час танцаў уключаецца поўнае святло, бо хтосьці п'яны некага шукае. Адзін раз люстра ўпала. У зале, дзе танцуюць, пастаянна брудна і цесна. Тыдзень назад усе разам выходзілі з РДК, а міліцыя схапіла аднаго нашага сябра і павезла ў аддзел.

– Відаць, ён быў п'яны?

– Ён быў выпіўшы. Але мы разам ішлі дамоў.

Вольга і Ірына, навучэнкі ПТВ-129, трохі спазніліся і на хаду, папраўляючы перад люстэркам свае прычоскі, адказвалі на мае пытанні:

– Кошт білета 30 тысяч – гэта дорага?

– Не, не дорага.

– Вы самі сабе білеты купляеце ці хлопцы?

– Бывае, што і хлопцы, але гэта здараецца рэдка. Часцей за ўсё мы купляем і сабе, і ім. А яны нас у сваю чаргу частуюць півам.

Студэнт чацвёртага курса БАТУ Сяргей кожны тыдзень прыязджае з Мінска ў Слонім, каб дапамагчы маці і бабулі. А вечарам ходзіць на дыскатэку. Але танцуе мала, больш любіць пагутарыць з сябрамі ці пазнаёміцца з новымі.

– У Мінску дыскатэкі каштуюць ад 400 тысяч рублёў і вышэй, – гаворыць ён. Студэнтам гэта не па кішэні. У Слоніме – танна. Але прыбытак у "Майстра" ёсць. Бо, як бачыце, акрамя білетаў, моладзь ахвотна купляе піва, гарэлку, напіткі. Шмат тут кураць, асабліва дзяўчаты. Дзе яны бяруць грошы – я не ведаю. Няўжо бацькі ім даюць? – здзіўляецца Сяргей.

Навучэнец Жыровіцкага тэхнікума Юрый і яго сябар, рабочы восьмай аўтабазы Сяргей, падышлі да мяне самі і пачалі выказваць свае крыўды:

– Спачатку "Майстар" быў добрай дыскатэкай, а цяпер – проста жах. Усе п'яныя, дзяўчаты таксама. Мы прыйшлі сюды адпачыць, а нас у прыбіральні пабілі...

Пасля 24 гадзін амаль усе адпачываючыя былі на добрым падпітку. А калі скончылася музыка і ў зале запалілі святло, памяшканне было проста не пазнаць. На сталах і падлозе валяліся бутэлькі, акуркі, коркі, папера... Адны хутка і лёгка пакідалі танцавальную залу, другія – драмалі за сталамі, а трэція хацелі яшчэ піць і танцаваць, але "Майстар" адыграў свой час.

НАВІНЫ

Святая справа

24 і 31 кастрычніка на гарадскіх могілках, што на Ружанскай вуліцы, пройдзе дабрачынная акцыя па добраўпарадкаванню магіл.

У мінулую суботу, 17 кастрычніка, падобная акцыя ўжо адбылася, але прыйшло мала людзей. Тым не менш, яны зрабілі шмат, каб прывесці ў належны выгляд магілы, дзе пахаваны 110 вайскоўцаў 79-га пяхотнага палка слонімскіх стралкоў літоўска-беларускай дывізіі. З часам месцы пахавання зараслі травою і хмызняком.

Хутка будзе свята Дзяды, дзень памінання продкаў. Менавіта да гэтага свята людзі імкнуцца наведаць парадак на месцах пахавання. Таму я запрашаю слонімцаў прыняць самы актыўны ўдзел у акцыі па добраўпарадкаванню Ружанскіх могілак.

Леанарда РЭЎКОЎСКАЯ, старшыня Слонімскага раённага аддзялення саюза палякаў Беларусі.

ПРАБЛЕМА

Беражыце нервы

У Слонімскім псіханеўралагічным дыспансеры на ўліку знаходзяцца 1500 чалавек, якія пакутуюць алкагольнай залежнасцю і каля 1600 з псіхічнымі расстройствамі.

Аб гэтым карэспандэнту "ГС" сказаў галоўны ўрач дыспансера Аляксандр Кандроўскі.

Кантынгент хворых, у асноўным, складаюць людзі сярэдняга ўзросту. Медыкаў насцярожвае тое, што ў апошні час значна павялічылася колькасць хворых сярод жанчын, якія пакутуюць алкагольнай залежнасцю. Цяпер на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансеры – 156 такіх жанчын. Значны рост псіхічных захворванняў назіраецца сярод асоб, якія ўжываюць наркотыкі. На ўліку ў гэтай медыцынскай установе сёння знаходзяцца каля 40 наркаманаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Новая кніга Васіля Супруна

Нядаўна ў Мінску пабачыла свет кніга "Жыць для Беларусі". Аўтар яе – наш зямляк, паэт і гісторык Васіль Супрун.

У кнізе змешчаны ўспаміны В.Супруна пра антысавецкае пасляваеннае маладзёжнае падполле на Слонімшчыне, пра сталінскія канцлагеры. Чытачы таксама змогуць пазнаёміцца з вершаванай лагернай перапіскай аўтара з паэткай Ларысай Геніюш. Выдавец кнігі – Архіў найноўшай гісторыі. Выдадзена яна ў рамках даследнага праекта "Антыкамуністычная апазіцыя ў Беларусі 1945-1991 гадоў".

Сяргей ЁРШ

Зекам повысили пенсию

Палата представителей Национального собрания приняла в первом чтении проект Закона «О внесении изменений и дополнений в Закон «О пенсионном обеспечении военнослужащих, лиц начальствующего и рядового состава органов внутренних дел».

Документ предусматривает изменение порядка выплаты пенсий лицам из числа военнослужащих и бывших сотрудников органов внутренних дел, находящихся в местах лишения свободы. Согласно внесенным изменениям, им будут выплачиваться 10 процентов назначенной пенсии по возрасту ежемесячно, но не менее 20 процентов минимальной пенсии. В тех случаях, когда размер пенсии превысит стоимость содержания в местах лишения свободы, будет выплачиваться разница между пенсией и стоимостью содержания.

Ранее выплата пенсий лицам указанной категории, находящимся в местах лишения свободы, приостанавливалась на время отбывания наказания.

Колхозы на грани банкротства

По данным министра сельского хозяйства и продовольствия Ивана Шаколо, на сегодняшний день 249 хозяйств Беларуси находятся на грани банкротства, 600 — являются потенциальными банкротами, 2000 — еле сводят концы с концами и только 65 сельхозпредприятий остаются рентабельными.

По мнению И.Шаколо, для того чтобы производство сельскохозяйственной продукции стало рентабельным, необходимо повысить закупочные цены на молоко на 64%, на мясо – в 2,2 раза. Однако, по расчетам Министерства экономики, подобное повышение закупочных цен должно вызвать и увеличение розничных цен на продукты питания от 50% до 120%.

Только за 9 месяцев текущего года из-за низких закупочных цен сельское хозяйство потеряло около 60 триллионов рублей, в связи с чем финансовое положение аграрного сектора ухудшилось в полтора раза. Долги совхозов и колхозов превысили 35 триллионов рублей, из которых 25 триллионов – кредитная задолженность банкам, 10 триллионов – долг государству по льготным кредитам.

БелаПАН

МАЛЮЕ ЯЎГЕН ІВАНОЎ

Гэта вам не жарцікі — "загрузіцца" раніцай у аўтобус №3, які ідзе да бальніцы. Асабліва, калі вам далёка за пяцьдзесят і вы сабраліся на прыём да траўматолага. У аўтобус, звычайна, трапляюць самыя дужыя. А хто не ўлез, то хоць пешкі дабірайся, хоць на таксі едзь — твой клопат.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5. Тэл. 2-14-39. (017)210-87-17 E-MAIL:gs@irex.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 21 кастрычніка 1998г. Час падпісання 8:00.
Надрукавана ў Баранавіцкай узбуйненай друкарні, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80.

Падпісны індэкс 64042.
Наклад 7.000 экз.
Заказ №2893
© «Газета Слонімская». Спасылка на «ГС» абавязковая.
Ⓡ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

ПОСАДИ СВОЕ ДЕРЕВО

23-24 октября в Жировичском монастыре будет проходить благотворительная акция, во время которой состоится закладка нового сада, ягодников, цветников. Откликнулись многие учреждения, организации, предприниматели и просто граждане. Разбивкой и планировкой сада будет заниматься кандидат сельскохозяйственных наук из БелНИИ плодоводства Дмитрий Гракович.

Недавно, бросив мирские дела, я посетил Жировичский Свято-Успенский монастырь, которому в этом году исполнилось 504 года.

На его территории расположено четыре храма: главный Свято-Успенский собор, Явленская, Крестовоздвиженская и Никольская церкви и монашеские корпуса, в которых постоянно обитают 35 иноков. Я слышал пенье в поздний час молящихся за нас монахов. Вспомнил "Мцыри" Лермонтова: "...не слышно пенья в поздний час молящих иноков за нас".

Здесь же расположена единственная в Беларуси духовная семинария, где учатся 245 семинаристов. В день моего приезда они работали на уборке картофеля. Всего в монастыре проживает около 400 человек, а еще ежедневно приходят и приезжают богомольцы, паломники... И всем находится пища и ночлег. Мне также любезно предоставили место в трапезной, и я отобедал с батюшками монастырского борща, сырников со сметаной и кофе с молоком. Молоко и сметана от монастырских коров, овощи и фрукты с монастырского сада и огорода. На ужин была картошка с рыбой и чай. Монастырь и семинария существуют за счет добровольных пожертвований и своего небольшого хозяйства.

Фото Владимира ЯНУШЕВИЧА

В недавнем прошлом монастырь пережил свои худшие времена, гонения и неприязнь властей. И, как результат, обветшали храмы, в запущенном состоянии находится территория вокруг монастыря. Монахи трудолюбивы, любезны и общительны. Здесь нет мата и ругани, курения и пьянства, и всего того, что есть за воротами монастыря.

Монах Макарий, который работает на монастырской пасеке, интереснейший собеседник. Он признался, что однажды его заворожил звук церковного колокола, в душе пробудилась тяга к Богу, и она привела его в духовную семинарию.

А вот Михаил стал послушником после окончания сельскохозяйственного техникума, работает в саду и огороде.

Послушник Олег в прошлом окончил консерваторию, пишет стихи, издает "Богословско-литературно-художественный листок". Я его нашел в пассажирском железнодорожном вагоне, который монастырю пожертвовала железная дорога. В нем в теплую пору года живут богомольцы, паломники и прихожане. Спит он на полке вагона, здесь же и пишет стихи, свои статьи об истории монастыря. Олег готовится стать монахом.

Если у кого возникло желание посадить в святой обители в Жировичах свою яблоню или грушу, вишню или абрикос, можете приехать в монастырь. Вас встретят, проведут, покажут, где и что сажать.

Слонимчанин, посади свое дерево, а иноки будут за тебя молиться.

Владимир ЖУКОВСКИЙ,
д. Деколы,
Барановичский район.

Фото Николая СУПРУНА

АМАЛЬ ЖАРТАМ

Каб ім лягчэй

Вайна. Немцы злавілі дзеда-партызана.

— Ну што, дзед? — пытаецца афіцэр праз перакладчыка. — Што ты сабе выбераш? Мы цябе можам расстраляць, можам павесіць...

— Ой, паночкі, рабіце, як вам лягчэй!..

Каўбой

Едзе новы беларус на кані. Перад ім роў.

— Я каўбой, я пераскочу, — кажа коннік і скача далей. Перад ім роў шырэйшы.

— Я каўбой, я пераскочу, — паўтарае ён і, пераскочыўшы, нясецца далей. Раптам перад ім вялізны роў.

— Я каўбой, я пераскочу.

А конь кажа яму:

— Ты каўбой, ты і скачы!

Дзірол і Карыес

Да новага беларуса, які адкрыў сваю фірму, заходзіць здаравяк і заяўляе:

— Мяне завуць Дзірол. Давай тысячу баксаў, і я буду абараняць твае зубы з ранку да вечара.

— Дык ты цяпер у мяне "крыша"?

— Толькі дзённая. Ноччу прыйдзе Карыес.

Падрыхтаваў Аляксей ЯКІМОВІЧ

ПРАШУ СЛОВА

ГІСТОРЫЯ ПАЎТАРАЕЦЦА?

Сёлета ў Слоніме няма ніводнага першага беларускага класа. У выніку, нашы дзеткі пазбаўлены магчымасці атрымліваць адукацыю на беларускай мове. Разам з тым мушу нагадаць, што нават у часы фашысцкай акупацыі былая школа №2 была цалкам беларускамоўная. Усе прадметы там выкладаліся толькі па-беларуску. Больш таго, яшчэ не ў такія далёкія для нас камуністычныя часы школа №1 таксама была беларускамоўнай. Не толькі з горада, але і з вёсак у першую школу хадзілі вучні, каб вучыцца на роднай мове.

Імклівы палёт роднай мовы пачаўся ў пачатку гэтага дзесяцігоддзя. Амаль ва ўсіх школах Слоніма, як грыбкі пасля цёплага дажджу, пачалі з'яўляцца беларускамоўныя класы. Бацькі з радасцю пасылалі туды сваіх дзяцей. Многія з іх казалі так: "Нам не далі вучыцца на роднай мове – дык няхай нашы дзеці вучацца".

"Чаму сёлета ўсё так рэзка змянілася?" – думаю я і міжволі ўспамінаю гісторыю нашага краю.

30 кастрычніка 1794 года царыца Кацярына II выдае Указ "Аб раздзяленні Вялікага Княства Літоўскага на тры часткі і аб спосабе кіравання імі", у якім гаворыцца наступнае: "... каб для ўсіх у Літве на ўсялякай мове друкуемых кніг, дробных сачыненняў і грамадскіх паведамленняў усталявана была цэнзура, без ухілення якой і без дазволу Галоўнага начальства нічога друкаваць і ў народ выдаваць не належыць...".

Аб тым, як выконваліся падобныя Указы, сведчыць дакладная запіска сенатара генерал-лейтэнанта Ахлёстышава ад 5 траўня 1853 года. Вось вытрымка з яе: "Пры гэтым не магу абысці маўчаннем, што выкараненне існуючай у Віцебскай губерні мясцовай гаворкі або дыялекту складае асаблівую цяжкасць...".

Беларуская мова расійскім царызмам выкаранялася, выкарчоўвалася паслядоўна, з асаблівым стараннем. Гэтую тактыку ў Заходняй Беларусі ўзялі на ўзбраенне белапольскія акупанты. Так, на скаргу беларусаў аб тым, што ўсюды закрываюцца беларускія школы, міністр асветы Скульскі адказаў: "Запэўніваю вас, што праз 10 год у Польшчы нават са свечкай не знойдзецца ніводнага беларуса". З гэтай нагоды хачу прывесці верш беларускага паэта Янкі Маланкі (сапраўднае прозвішча Іван Маразовіч) "Беларускай школы хочуць...". Ён быў надрукаваны ў 1926 годзе, але, думаецца мне, актуальны і цяпер.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

Беларускай школы хочуць

Янка, Тодар, дзядзька Клім
Доўга думалі аб тым,
Як бядзе той пасабіць —
Школу родную адкрыць:
Каб урэшце ясна сонца
Засвяціла нам у ваконца,
І асветы промень ясны
Беларус пазнаў няшчасны.
Вось парады
ў думках гэтых
Пачалі шукаць ў газэтах...
І чытаюць, што наўкола
Пустае родная школа,
Толькі трэ'
сабраўшы сход,
Напісаць, што сам народ
Аб асвеце ўсё клапоча —
Беларускай школы хоча.
Вось, па солтыса загаду,
Сабраліся ўсе на раду
І зрабілі прыгавор:
Каб у вёсцы Чорны Бор
Школу родную адкрыць...
Галавы каб не дурыць
Сваім дзеткам
так на волі...
Хочам школы — і даволі.
Дзядзька Клім
і Тодар з Янкам
У дарогу выйшлі ранкам,
Каб прад панам
інспектарам
Быць назаўтра
з прыгаворам.
І прыйшлі яны да мэты
Ды знайшлі будынак гэты,
Прастаялі там ад рання
Без гарбаты і сняданя.
Увайшлі яны за дзверы,
Падалі свае паперы
І пачулі яны ўраз
Міласцівейшы адказ:
"Добра, добра,
мае людзі!
Хай па вашаму ўжо будзе.
Толькі трэба пачакаць!"
(Так гадкоў мо'
з дваццаць пяць...)

"Авадзень", дватыднёвік крытыкі, жартаў і смеху, Вільня, 1926 г. **Янка МАЛАНКА**

"ДАРАГІ МОЙ ЗЯМЛЯК"

У апошні час у "Газеце Слонімскай" бадай у кожным нумары сталі з'яўляцца карэспандэнцыі аб неабходнасці паставіць у Слоніме помнік Л. Сапегу. Толькі чамусьці ў адзін голас, нібыта па падказцы, усе гамоняць аб тым, што, нібыта, узвядзенню помніка Л.Сапегу перашкаджае помнік У.І.Леніну. Такім чынам "ГС" узяла на сабе функцыю па фарміраванню грамадскай думкі ў Слоніме наконт помніка "вождю мирового пролетариата, основателя первого в мире социалистического государства", але чамусьці не дапускае на старонкі газеты ніводнага водгуку ад прыхільнікаў Уладзіміра Ільіча, быццам у Слоніме такіх і няма. Таму прашу надрукаваць у вашай газеце мой ліст у абарону помніка Леніну.

Хто больш вялікі – Ленін, які належыць усяму свету, ці нікому невядомы, акрамя слонімцаў і гісторыкаў, Сапега? Мусіць, гэта рашаць не нам, за нас гэта зрабіла яе Высокасць Гісторыя. І калі мы жадаем ісці ў так званы цывілізаваны свет, то трэба паглядзець, як там вырашаюцца такія пытанні. У Парыжы, напрыклад, лагодна існуюць помнікі Напалеону, каралям і кардыналам, удзельнікам штурму Бастыліі, Парыжскай Камуны, Гаўрошу, Жане Д'Арк, адна з вуліц пралетарскага раёна носіць імя У.І.Леніна. А ў месцах, дзе быў гэты вялікі чалавек, устаноўлены мемарыяльныя дошкі. Нешта падобнае ёсць і ў Швейцарыі, Германіі, Фінляндыі. Гэта ў цывілізаваных краінах, а ў нас? А ў нас – на ўзроўні варвараў, таму што жывём не сваім розумам.

Але вернемся да помнікаў. Я лічу, што ў Слоніме хопіць месца і для помніка У.І.Леніну, і для помніка Л.Сапегу, толькі з гэтага не трэба ствараць праблему, як гэта робіць у сваім артыкуле паважаны архітэктар М.Якаўцаў, гаворыць аб тым, што помнік Л.Сапегу трэба ставіць на месцы помніка У.І.Леніну. На яго думку, помнік на другім месцы не будзе глядзецца, быццам "у цемры і золата не блішчыць". Золата, дарагі мой зямляк, яно і ў Афрыцы золата. Акрамя таго, на гэты конт ёсць і другі выраз: "Не ўсё тое золата, што блішчыць!" Але, паважаны, вы маеце рацыю ў тым, што "не трэба вельмі спяшацца з месцам усталявання помніка".

Ушаноўваючы аднаго дзеяча, мы зневажаем другога. І як жа мы, мае даражэнькія, будзем "мець духоўную спагаду", калі "величайшего из всех известных людей мира" (так пісаў пра Леніна Д.Рыд) мы апусцім ніжэй за мястэчковага старасту, магчыма, добрага.

Яшчэ літаральна некалькі слоў наконт "несумяшчальнасці помніка Леніну з праваслаўным саборам". І тут няма нічога несумяшчальнага, бо запаветы Хрыстовы аб роўнасці, братэрстве, любові да бліжняга знайшлі жывы водгук у ленінскім вучэнні. Больш таго, менавіта наша Беларусь, ідучы ленінскім курсам, дала свету вялікую плеяду выдатных вучоных, музыкантаў, інжынераў, пісьменнікаў. Гэта наша краіна ў складзе СССР разбіла мацнейшую ў свеце фашысцкую армію, гэта яна апярэдзіла многія буйныя краіны свету па вытворчасці мяса і малака, бульбы і ільну, трактараў, аўтамабіляў, станкоў, тканіны і г.д. І пасля ўсяго гэтага (прабачце, некаторыя з нас) гатовы абразіць імя чалавека, які садзейнічаў гэтаму. Таму звяртаюся да вас, мае родныя, да ўсіх, хто мае сумленне, – абаронім помнік Вялікаму Чалавеку – Уладзіміру Ільічу Леніну.

А наконт помніка Льву Сапегу, то яго можна ўстанавіць на плошчы, якая носіць яго імя ля касцёла св. Андрэя. Добра б ён глядзеўся таксама і ў парку, ці на новым праспекце Незалежнасці, ці на прывакзальнай плошчы. Трэба памятаць – разбураюць без разумення толькі варвары, не будзем жа падобнымі на іх.

В.ЗГОМЛЯ

НАШ ФОТАКОНКУРС

"У АБ'ЕКТЫВЕ — ДЗЕЦІ"

Kodak EXPRESS магазин **1000 мелочей**

Спі, мой Васька, засні,
Хутка патухнуць агні.

Фота даслала Вольга СТРАЛКОЎСКАЯ

Kodak EXPRESS магазин **Юбилейный**

Тэхніка падвяла

Фота даслала Таццяна БУЛАНАВА

Kodak EXPRESS универсам **Дружба**

З лялькай мне весела...

Фота даслала Наталля ЖУК

АНЕКДОТЫ *из Интернета*

➨ - Алло, здравствуйте, у вас доллары есть в продаже?
- Да, пожалуйста.
- А по какому курсу?
- По пятьдесят тысяч рублей.
- ???? Извините, это банк?
- Нет, это ТИПОГРАФИЯ!

➨ Муж собирается на работу и спрашивает жену:
- Ты мой пиджак почистила?
- Да, дорогой.
- А брюки?
- Разумеется, дорогой.
- А ботинки?
- А у тебя и там карманы есть?

➨ Ночью работник ГАИ останавливает горбатый запорожец, глянул, а там 17 пьяных в дрова мужиков. Тот настолько обалдел, что и штрафовать не стал. Только, говорит, чтоб завтра в том же составе ко мне трезвыми явились.

Наутро начинают утрамбовываться в машину, 16 влезли, а 17-й, хоть убей, никак. Водитель и спрашивает:

- Слушай, а может быть, тебя с нами не было?

Семнадцатый (возмущенно): - Здрасте! А кто ж вам вчера на баяне играл?

➨ В институте на вступительном экзамене экзаменатор спрашивает абитуриента: - И напоследок, скажите, пожалуйста, почему вы решили поступить именно в наш институт? Абитуриент: - Пап, не задавай глупых вопросов...

➨ Идет экзамен типа «тест с вопросами», на которые надо отвечать «да» или «нет». Один из студентов подбрасывает монетку и записывает результаты. Препод думает: «Ну, этот первым закончит.» Экзамен закончился, остальные студенты уже написали и ушли, а этот всё сидит и монетку подбрасывает. Преподователю это надоело, он подходит и спрашивает: - Ну что, ответил на вопросы? - Да. - А чего тогда делаешь? - Проверяю.

➨ Заходит студент на экзамен и без разговоров ставит на стол бутылку коньяка. Экзаменатор смотрит и произносит: - Удовлетворительно. Студент вытаскивает коробку шоколадных конфет. Экзаменатор: -Хорошо. Студент кладёт сверху шикарную авторучку. Экзаменатор: - Отлично, - и пишет в зачетке. Студент забирает зачетку, сгребает все со стола и говорит: - Теперь еще физику надо сдать.

➨ В самолете. Стюардесса подходит к командиру и говорит: - В салоне террорист с бомбой спекулирует парашютами.

➨ Приходит мужичок в магазин. Смотрит - на прилавке что-то красивое, воздушное, легкое. Он подходит к продавщице и спрашивает: - Скажите, а что это у вас там такое красивое, легкое, воздушное? - Да это ж йогурт! - А-а-а! (мечтательно) Йогурт!.. Две бутылки «Зеленого яблока», пожалуйста.

➨ Разговаривают две сестры: старшая (замужняя) и младшая (незамужняя). Младшая: - Как же это, наверное, хорошо, когда ты замужем... Старшая: - Это хорошо вне зависимости от того, замужем ты или нет.

У Слонімскім аддзеле ЗАГСа зарэгістравалі шлюб:

Гвазданаў Яўген і Несцер Наталля
Жук Сяргей і Марчык Наталля
Парай Анатоль і Бурсевіч Алена
Сыслаў Максім і Быкавец Алена
Жылінскі Сяргей і Белавус Анжаліка
Шырокаў Дзмітрый і Лукашэвіч Алена
Ратанаў Аляксандр і Жукава Любоў
Рудзько Дзмітрый і Мазалевіч Вольга

ШЧАСЦЯ ВАМ!

За мінулы тыдзень у Слонімскім аддзеле ЗАГСа зарэгістраваны дзеткі, якія нядаўна нарадзіліся:

Барысік Павел
Захажэўскі Іван
Андрайчук Валерыя
Ляшэвіч Аляксей
Бялько Аляксей
Навіцкі Максім
Жукоўскі Ягор

КАГО НАМ БУСЕЛ ПРЫНЁС?

СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ

✝

Шухно Соф'я Аляксандраўна	1910 г.н.
Ляшэвіч Іван Аляксандравіч	1923 г.н.
Ляўкевіч Фёдар Мікалаевіч	1954 г.н.
Клімашэўская Міхаліна Адамаўна	1910 г.н.
Маскаленка Валянціна Іванаўна	1939 г.н.
Баневіч Генадзій Вікенцьевіч	1939 г.н.
Мозераў Іван Іванавіч	1931 г.н.
Медушэўская Наталля Мікалаеўна	1951 г.н.
Гундар Аляксей Мікалаевіч	1949 г.н.
Нікіцюк Уладзімір Мікалаевіч	1954 г.н.
Шымчак Карл Ігнацьевіч	1942 г.н.
Шыц Вольга Сямёнаўна	1919 г.н.
Раманава Надзея Сцяпанаўна	1914 г.н.
Галуза Аляксандр Міхайлавіч	1940 г.н.
Калейнік Юрый Аляксандравіч	1964 г.н.
Аўсянін Анатоль Мартынавіч	1934 г.н.
Бічэўская Ганна Мікалаеўна	1931 г.н.
Яфімік Мікалай Уладзіміравіч	1945 г.н.

КРОССВОРД *от Владимира ВАШУТЫ*

По горизонтали:

2. Актер и режиссер, народный артист СССР. 7. Известный советский композитор. 10. Музыкальный духовой клавишный инструмент. 13. Обособленнный земельный участок с усадьбой владельца. 15. Название некоторых крупных мужских монастырей в дореволюционной России. 17. Народный писатель Латвии. 20. Древнескандинавская или древнеирландская героическая или историческая повесть. 21. Известная актриса театра и кино, народная артистка СССР. 22. В бывшей Пруссии: крупный помещик. 23. Посещение больного врачом. 24. План намеченной деятельности. 25. Государственный переворот. 26. Социалист-революционер, член кулацкой контрреволюционной партии. 28. Духовой музыкальный инструмент. 30. Разгульное, разнузданное пиршество. 31. Сорт кирпича, изготовляемого из глина с примесью соломы и волокнистых веществ. 35. Великий русский математик. 36. Русская народная песня.

По вертикали:

1. Рубящее и колющее оружие. 3. Действительное, невыдуманное событие, явление. 4. Татарское войско, вторгшееся в пределы Древней Руси. 5. Драгоценный камень. 6. В Древнем Риме: площадь для собраний, выступлений. 8. Строительное искусство. 9. Русская плясовая песня. 11. Исследователь древних рукописей. 12. Персонаж комедии Д.И. Фонвизина "Недоросль". 14. Корнеплод семейства крестоцветных. 16. Специальная дощечка для смешивания красок. 18. У мусульман: одежда женщин. 19. Последовательный ряд звуков, повышающийся или понижающийся в пределах одной или нескольких октав. 27. У древних греков: одежда в виде длинной рубахи. 29. Столица европейского государства. 32. Река, приток Немана. 33. Высшая точка неба над головой наблюдателя. 34. Натуральный налог, который платили царским властям народы Сибири и Поволжья.

ОТВЕТЫ НА КРОССВОРД (№42)

По горизонтали: 1. Акр. 2. Раж. 3. Жар. 4. Риф. 5. Фен. 6. Нил. 7. Луч. 8. Чек. 10. Тик. 11. Кок. 12. Куб. 13. Быт. 14. Тёс. 15. Сак. 16. Кам. 17. Мат. 19. Куш. 20. Шум. 21. Мир. 22. Рюш. 23. Шик. 24. Кон. 25. Нож. 26. Жук. 28. Туф. 29. Фес. 30. Сом. 31. Мех. 32. Хор. 33. Роб. 34. Бад. 35. Дам. 37. Мот. 38. Тип. 39. Пыл. 40. Лик. 41. Кук. 42. Кар. 43. Реж. 44. Жёф. 46. Чин. 47. Нюх. 48. Хам. 49. Мед. 50. Дил. 51. "Лес". 52. Соя. 53. Ясс. 55. Тир. 56. Рот. 57. Таз. 58. Зоб. 59. Боб. 60. Бак. 61. Кио. 62. Озд. 64. Лёд. 65. Дон. 66. Нок. 67. Кос. 68. Сус. 69. Сал. 70. Лан. 71. Ном. 73. Бек. 74. Кын. 75. Ним. 76. Мэн. 77. Ной. 78. Йен. 79. Нея. 80. Ява.

По вертикали: 1. Акт. 2. Рак. 3. Жок. 4. Раб. 5. Фут. 6. Нос. 7. Лук. 8. Чум. 9. Кот. 10. Тюк. 11. Киш. 12. Ким. 13. Бар. 14. Туш. 15. Сок. 16. Кан. 17. Муж. 18. Так. 19. Кит. 20. Шеф. 21. Мыс. 22. Ром. 23. Шах. 24. Кур. 25. Наб. 26. Жад. 27. Кум. 28. Тим. 29. Фат. 30. Суп. 31. Мел. 32. Хек. 33. Рок. 34. Бор. 35. Деж. 36. Миф. 37. Меч. 38. Тон. 39. Пах. 40. Лом. 41. Код. 42. Кол. 43. Рис. 44. Жья. 45. Фес. 46. Чёт. 47. Нер. 48. Хит. 49. "Маз". 50. Дуб. 51. Луб. 52. Сук. 53. Яко. 54. Сад. 55. Тол. 56. Рид. 57. Тын. 58. Зак. 59. Бас. 60. Бес. 61. Кал. 62. Орн. 63. Дом. 64. Лоб. 65. Док. 66. Нан. 67. Кам. 68. Сан. 69. Сай. 70. Лен. 71. Ноя. 72. Мга.

РЭКЛАМА

Газета Слонімская
22 — 28 кастрычніка 1998г., № 43 (72)

Стоимость объявлений для частных лиц.

Объявление может быть помещено бесплатно. Для этого необходимо вырезать купон бесплатного объявления, заполнить его и отправить по почте или же принести в редакцию. **Бесплатные объявления публикуются в порядке очереди по мере поступления.**

Если вы желаете, чтобы ваше объявление было выделено из общего текста, мы предлагаем оформить его в рамку. Эта услуга стоит 100 тысяч рублей. По Вашей просьбе объявление повторяем в следующем номере бесплатно.

Оформленное поздравление стоит 150 тысяч рублей, поздравление с фотографией — 200 тысяч.

Оплаченные объявления размещаются в нашей газете вне очереди

Стоимость рекламных площадей для организаций.

В газете применяется модульный метод размещения рекламы. Размер одного модуля — 4х4 см, его базовая стоимость — 400 000 руб.

Система скидок за:
последовательное размещение:
-5 номеров (Месяц) -10%
-9 номеров (2 месяца) -15%
-13 номеров (3 месяца) -20%
-26 номеров (полгода) -30%
-52 номера (год) -40%

публикацию рекламных статей-25%
надбавка за публикацию на:
1 полосе +100%
программе +50%

Контактные телефоны:
(01562) 2-14-39 - факс
(017) 210-87-17

Вы хотите поместить объявление (поздравление) не посещая редакцию.

Для этого необходимо перечислить соответствующую сумму почтовым переводом с ближайшего отделения почтовой связи на расчетный счет редакции:

№ 3012014050016 в АСБ "Беларусбанк", филиал 422 в г. Слониме, код 852, и отправить в конверте текст объявления (поздравления) с квитанцией об оплате на адрес редакции:

231800, г.Слоним, ул. Я.Купалы, 5 или г.Слоним-2, а/я 5.

Оплаченные объявления размещаются в нашей газете вне очереди.

ЖИДКИЕ ОБОИ по испанской технологии
Красивый, экологически чистый продукт европейского качества для квартир, офисов и учреждений
Тел. 2-62-32, 2-04-59

СДАМ В АРЕНДУ легковой прицеп. Тел. 4-16-28.

СЪЕМКА НА ВИДЕОКАМЕРУ семейных торжеств, детей. Возможен б/н расчет. Лиц. № 202 от 18.05.94. **Тел. 4-19-15.**

Мука высший сорт, сахар от 25 кг с доставкой по городу и району
т. 4-23-83 4-18-59

Врач акушер-гинеколог консультирует и предлагает **ЛЕЧЕНИЕ** с использованием биологически активных добавок. **Тел. 5-14-82.**

Утерянное удостоверение инвалида II группы Курьяна Анатолия Ивановича считать недействительным.

Сдам на прокат красивый свадебный наряд, недорого. **Тел. 2-69-20.**

СДАМ ГАРАЖ в районе Заозерный. Тел. 2-95-59.

МЕНЯЮ ДОМ по ул. Гагарина, все удобства, на квартиру с доплатой, или продаю, 14500 у.е. **Тел. 2-38-62** (после 18.00).

МЕНЯЮ кирпичный дом в д. Костени в 5 км от Слонима, есть газ, вода, приусадебный участок, х/постройки на 2-комн. квартиру. **Тел. 94-6-39.**

Стиральные машины-автомат б/у (пр-во Германии)
Современный дизайн. Большой выбор моделей. Доступные цены. Продажа, ремонт, гарантия.
Тел. в Лиде 2-89-78, 2-15-08, 2-61-12.

ГРУЗОПЕРЕВОЗКИ ПО РБ И СНГ А/М— МАН грузоподъемность 4-4,5 т, объем 35 м³, 2 посадочных места, ф/о любая. Тел. 2-28-11. Лицензия сер. АА N 5-1955 от 25.06.98 г.

ПРАДАЮ

●новую цигейковую шубу, черную, мутоновую, р.48-50. Тел. 2-14-33.

●прицел для охотничьего ружья "Русак". Тел. 5-17-11 (после 19.00).

КАРТОФЕЛЬ отборный и мелкий. Цена договорная. **Тел. 2-11-83.**

●щенков добермана от чемпиона 98 г. Тел. 2-97-57.

●отрезы драпа на пальто. Тел. 3-12-81.

●мелкий картофель, недорого. Тел. 5-22-46.

ДОСКУ 60 мм из сушилки дл. 6м необр., **МИНИ-ТРАКТОР** (диз.) с навесным и прицепом (недорого). **Тел. 2-58-78.**

●плитку облицовочную, гипсовую, для внутренних работ. Тел. 4-18-89.

●детский манеж, б/у. Тел. 2-31-29.

●чайно-кофейный сервиз "Пастушка", (Германия). Тел. 3-11-55.

Палатку армейскую, **вагончик-бытовку**, **бочку** 4м³, самосвал **ГАЗ-52**, недорого, возможно в кредит, весы мех. торговые. **Тел. 4-16-28** (после 19.00).

●золотые обручальные кольца. Тел. 3-11-55.

●мех бобра коричневого цвета. Тел. 4-27-18.

●женское зимнее пальто с норкой р.52/2. Тел. 2-24-68.

●кирпич белый, красный, блоки силикатные. Тел. 2-39-31 (до 8.00, после 21.00).

●доску, сосна, 50-40-25 мм. Тел. 2-27-22.

●ковер 2,70х3,70 (Бельгия). Тел. 2-31-29.

●комплект ковровый на диван и кресла, цвет зеленый. Тел. 2-31-29.

●шубу из горного козла, нов., р.48-50, 200 у.е. Тел. 5-15-52.

●крупный картофель, 8 тыс. за кг. Тел. 73-2-25.

●коляску дет. 3-функц. Тел. 2-20-77.

●шапку-обманку (норка) р.54, недорого. Тел. 4-14-38.

●ворота въездные без калитки. Тел. 3-25-83.

●гипс строительный. Тел. 2-47-16

●свадебное платье, 60 у.е. Тел. 2-41-83.

●раму на балкон Энки. Тел. 4-13-24.

●овец, коз. Тел. 76-6-17.

Парасят пародзістых. Тэл. 2-29-67.

●электрошоковое устройство "S-SYS-1". Тел. 2-56-29.

●одежду и снасти для зимней рыбалки. Тел. 5-28-55.

●стройматериалы: кирпич, блоки, фундаментные блоки. Тел. 4-27-82.

●телку, 10 мес., 100 у.е. Тел. 2-32-35 (после 18.00).

●новую 2-местную лодку "Уфимка-2". Тел. 2-06-73.

●аквариум и микрокомпрессоры к нему. Брестская, 109-50 (после 18.00).

●картофель мелкий. Тел. 2-10-47 (после 18.00).

●плуг конный. Тел. 5-17-85.

●чугунную батарею. Тел. 5-17-85.

●запчасти к МТ-10. Тел. 5-17-85.

●пианино "Беларусь", б/у. Тел. 2-51-48.

●чугунную ванну. Тел. 5-22-41.

НЕРУХОМАСЦЬ

●дом в Русаково, с х/п, 9 км от Слонима, 1800 у.е., торг. Тел. 2-65-06.

●деревянный дом в Загритьково. Тел. 71-2-74.

●2-комн. кв-ру на 3 эт., в р-не м-на "Спутник". Тел. 5-13-10.

Дом в Кричеве (все удобства, сад, огород, 12 соток, телефон, гараж) **или меняю** на Слоним или Минск. Рассмотрим все варианты. **Тел. в Слониме 2-92-03.**

●дер. дом в Альбертине (б/удобств, с телефоном, приус. уч-ок) или меняю на 1-комн. кв-ру. Тел. 2-58-55.

КВАРТИРУ 2-комн. по пр.Независимости, гараж в р-не ул. Кирова. **Тел. 2-31-98** (после 17.00).

●кирпичн. дом в Мостах, есть гараж, сад, хозпостройки. Тел. 71-2-74.

1/2 ДЕРЕВЯННОГО ДОМА в центре города,удобства, земельный участок, гараж. **Тел. 2-00-20.**

●гараж в Заозерном. Тел. 2-29-60 (после 16.00).

Квартиру 3-комнатную на Энке, 4 этаж, 41,5 м2. Тел. 4-20-18.

●земельный уч-ок с фундаментом в Альбертине. Тел. 5-28-95 (после 18.00).

ГАРАЖ в кооперативе "Эдельвейс" с подвалом, **"АУДИ-80"** 80 г.в., бензин. **Тел. 5-26-84.**

●кирп. жил. дом в 4 км от Слонима, есть гараж, подвал, лет. кухня. Тел. 90-4-66.

●3-комн. кв-ру улучшенной планировки. Тел. 5-16-72.

ГАРАЖ в ГСК "Гарнизонный" (Срочно). Тел. 2-00-27.

●3-комн. приват. кв-ру на Энке, 2 эт., 2 балкона. Тел. 4-22-28.

ГАРАЖ в ГСК "Гарнизонный", 1800 у.е. Тел. 4-25-46 (после 20.00).

●дачный уч-ок в Якимовичах с домом 5х6. Тел. 5-25-06.

ГАРАЖ в ГСК "Гарнизонный". Тел. 4-11-05.

●дачу в р-не Дубино. Тел. 5-15-53.

●дом в Задворье, Василевичского с/с. Тел. 2-43-84.

Гараж металлический, передвижной, утепленный. Тел. 2-52-01 (р.), 2-77-51 (д.).

●3-комн. приват. кв-ру в центре города, 12 т.у.е. или меняю на 1-комн. кв-ру с доплатой. Тел. 2-97-91 (после 18.00).

●дом в Альбертине. Тел. 2-38-80 (раб)., 2-91-44.

●недостроенный дом в р-не КПФ, 1 этаж. Тел. 4-12-39.

●2/3 кирпичного дома в центре города со всеми удоб-ми. Рыщицы-1, пер. Куйбышева, 50.

●2-комн. кв-ру в военном городке. Тел. 2-49-57 (8.00-17.00), 5-19-97.

●гараж в Эдельвейсе (подвал, яма). Тел. 5-26-84.

●дом в Поречье или меняю на 1-комн. кв-ру. Тел. 2-41-02.

●2-комн. кв-ру на Энке, 2 эт. Тел. 4-10-28.

●дачу в Чемерах, возможны варианты. Тел. 4-24-00.

●полдома в Жировичах, есть телефон, 50 м². Тел. 5-10-93.

●гараж в Эдельвейсе без подвала со смотровой ямой, отделкой. Тел. 5-23-39 (после 18.00).

●половину кирпичного дома (три комнаты, кухня вода, газ) есть сарай, гараж, уч-ок. Тел. 2-70-47.

●1-комн. кв-ру. Тел. 2-38-80, 2-91-44.

●деревянный дом в Новогрудке, приус. уч-ок 20 сот. Тел. 4-16-44.

●1-комн. кв-ру. Тел. 2-38-80, 5-19-78.

●гараж (капитальный) в "Эдельвейсе" или меняю на иномарку. Тел. 5-28-02.

●гараж в "Эдельвейсе", недорого. Тел. 4-16-44.

●гараж 3,5х10,5м у "Заазерным", 1700 у.а. Тэл. 5-15-56 (хатн.), 5-18-63 (раб.).

●2-комн. кв-ру на Энке, 3 эт., 52,5 м². Тел. 5-15-14.

●2-комн. кв-ру. Тел. 2-38-80, 5-19-78.

●2-комн. кв-ру по пр.Независимости. Тел. 2-90-33 (после 17.00).

АЎТАРЫНАК

●а/м "Форд-Сьерра", 2,3Д, 88 г.в., универсал, дуги, литые диски. Тел. 2-09-48.

ВАЗ-2109 1993 г.в. из Германии. **Тел. 2-35-23.**

●Москвич-2140, 1984 г.в., в отл. состоянии, цвет твин-вишня. 950 у.е. Тел. 3-21-45

МАЗ-500 из Германии тентованный, бортовой, в хорошем состоянии. **Тел. 2-91-20.**

●а/м ВАЗ-21061 бензин-газ, 1,5, в хор. сост. Тел. 5-13-22 (после 18.00).

"Форд-Сьерра" 1987 г.в., газ-бензин. Тел. 94-2-94.

ВАЗ-2163 1994 г.в., 3000 у.е., торг уместен, срочно. **Тел. 4-16-37.**

●а/м "Гольф-2" 88 г.в., синий раст., дизель. Тел. 3-21-72.

ВАЗ-2113 1988 г.в. в хор.состоянии, цена договорная. **Тел. 4-12-61.**

●ВАЗ-21013 86 г.в., в хор. сост., салон 07, 1300 у.е., торг. Тел. 5-22-46.

"Опель-Аскона" 86 г.в., объем 1,6 см³. Тел. 3-23-02.

компания ФИЛИПП
САВ г. Барановичи, ул.Комсомольская,22, тел./факс 2-51-77
Предлагает:
- стеновые панели от 7,5 у.е. кв.м;
- сайдинг от 6,5 у.е. кв.м;
- пол ламинированный от 18 у.е. кв.м;
- потолок подвесной от 9 у.е. кв.м;
- плитку от 13 у.е. кв.м;
- световое оборудование в ассортименте;
- фурнитуру;
- лаки, краски, штукатурку в ассортименте.

ДЛЯ ОПТОВЫХ ПОКУПАТЕЛЕЙ ГИБКАЯ СИСТЕМА СКИДОК.
ОПЛАЧИВАЕМ ПОСРЕДНИЧЕСКИЕ УСЛУГИ.
ИЩЕМ РЕГИОНАЛЬНЫХ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ.
По желанию заказчика производим ремонтно-отделочные работы.

Молодая семья СНИМЕТ квартиру, желательно в микрорайоне Энка. Тел. 4-26-22.

СНИМУ 1-комнатную квартиру. Оплату и порядок гарантирую. Тел. 2-61-80 (9.00—16.00).

РАДИОТАКСИ САДК
услуги круглосуточно
5-17-20

Фирме "Белтабакконтракт"
срочно требуется на работу агент по реализации с личным автомобилем.
Тел. 2-61-80 (9.00-16.30).

ЗЕБРА
Все виды бумаги для делопроизводства. А также самая дешевая писчая бумага! Спрашивайте бумагу марки "Зебра"
Слоним, Красноармейская, 73. Т. (262) 2-50-57 Агентство ДЕЛО

ЕВРО ОФИС все для офиса
Предлагает Вам комплект мебели **«КОМПАКТ»**
Как эффективно использовать небольшую площадь офиса? Мебель серии "Компакт" позволяет решить любые проблемы рабочего пространства. Эта мебель создаст уют в Вашем офисе и подчеркнет характер помещения.
Вы получите максимум удобств на минимальной площади, если обратитесь по адресу: г.Барановичи, ул.Загородная, 1. Тел. (01634) 2-33-58, 2-12-35
Наши цены и качество выгодно отличаются от других

РАДИОТАКСИ ФЕНИКС
2-12-88
КРУГЛОСУТОЧНО

Лицензия мин.промышленности № 587 от 12.12.97г.
группа CJS
Тел. 2-60-50
Факс 2-66-50
Компьютеры и оргтехника

МАГАЗИНЫ «SH» ПРЕДЛАГАЮТ
- **Ткани на вес! (Германия) — велюр, флок, сатин, ворсолан и т.д.**
- **Обои (Голландия), дорожки тафтинговые (на вес) (Германия), кожа искусственная, черная (Германия)**
- **Рукавицы рабочие х/б, возможна оплата по б/н.**
- **Одежда «Sh» осеннего ассортимента: куртки, джемпера.**

Магазины СХ по ул. Черняховского, 2; пл. Ленина, 11 Тел. 4-24-91.
в магазинах "Секонд Хэнд"

АФІША
Кінатэатр «МІР»
22 кастрычніка — "Ледзяное пачуццё" (ЗША). Сеансы ў 15, 17, 19, 21.00.
23 кастрычніка — "Голая мішэнь" (ЗША). Сеансы ў 15, 17, 19 (пад.), 21.00.

Дорогая и любимая внученька, сестричка, доченька

Олюшка Носик!

С днем рождения тебя!

Аромат всех цветов и румянец зари
Мы готовы тебе в этот день подарить!
Нежность роз поутру, свет, тепло, доброту,
Много ласковых слов и земную любовь,
Все, что светлое есть и большое в судьбе,
Мы желаем все это сегодня тебе!

Бабушка, сестричка Иннушка, мама

Калишук Анна Николаевна!

Поздравляем тебя с 19-летием!

Желаем счастья много-много,
Хотим, чтоб в жизни молодой
Твоя широкая дорога
Не стала узкою тропой.
Еще любви тебе желаем —
Огромной, чистой, как слеза,
Хотим, чтоб вечно улыбались
Твои счастливые глаза!

Андрей, Таня, друзья

Лагутик Александр Анатольевич!

Поздравляем тебя с днем рождения!

День рождения — особая дата,
Этот праздник ни с чем не сравнить,
Кто-то добрый придумал когда-то
Имениннику радость дарить.
Пусть будет жизнь твоя прекрасной,
В семье погода только ясной,
Здоровья, радости, любви
От всей души желаем мы.

Татьяна, Сергей

Якубчик Нина Константиновна

Горячо и сердечно поздравляем тебя с 40-летием со дня рождения!

Прекрасный возраст — 40,
Его прожить не так-то просто,
В кругу семьи, в кругу друзей
Желаем встретить девяносто!
Пусть будут счастливы годы, что впереди,
А те, что прожиты, уйдут в воспоминанья.
Желаем жизни улыбаться,
По пустякам не огорчаться,
Не скучать и не болеть,
Долго жить и не стареть.

Коллеги «Беларусбанк»

Дорогой наш

Вадим Николаевич Борисик!

Поздравляем с 30-летием!

От чистого сердца, простыми словами,
Позволь с днем рожденья поздравить тебя,
За то, что ты есть, за то, что ты с нами
Обнять тебя крепко любя.
За доброе сердце, за ласку и нежность,
Что нам ты всегда отдаешь,
За то, что работу, заботу и радость
В семье ты по жизни несешь.

Твои Людмила и Полина

Дорогая

Гражинка Бардун!

Поздравляем тебя с 18-летием.

Желаем жить, как в дивной сказке,
Здоровья, сил, любви и ласки,
Успехов, счастья, красоты
И чтоб сбывались все мечты.

Тетя Таня, дядя Женя, Саша и Катя

Поздравляем

Гаталова Сергея Ивановича

с 30-летием!

Пусть хранит тебя господь,
Коль это в его власти.
Здоровья, радости, любви
И много-много счастья.

Мама, папа

Дорогая и любимая бабушка и мама

Зимницкая Янина Степановна!

Поздравляем вас с юбилеем!

От души желаем не болеть,
Счастье полное иметь,
Никогда не волноваться,
В жизни чаще улыбаться.

Сын, невестка, внучки

Только для рекламодателей "Газеты Слонімскай"!

